Весці БДПУ. Серыя 1. 2019. № 2. С. 95–99

УДК 81'38:[811.161.3:81'367.625]Л.Дранько-Майсюк

СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ДЗЕЯСЛОЎНЫХ ФОРМ НА МАТЭРЫЯЛЕ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ Л. ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

М. А. Трыгук,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры рускай мовы для замежных грамадзян МДЛУ

Паступіў у рэдакцыю 01.02.19.

Адным з падыходаў да інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту з'яўляецца стылістычны аналіз, пры якім у цэнтры ўвагі знаходзіцца індывідуальна-аўтарскі стыль, у прыватнасці граматычныя адзінкі як адзін са сродкаў яго стварэння. Матэрыялам для даследавання паслужылі вершы пра каханне са зборнікаў «Магчымасць незвычайная» і «Стомленасць Парыжам» Л. Дранько-Майсюка – папулярнага сучаснага аўтара, творы якога арыгінальныя па змесце і сродках яго выяўлення. У артыкуле вызначаны характэрныя для індывідуальна-аўтарскага стылю паэта дзеяслоўныя формы і іх стылістычныя асаблівасці, апісана іх роля ў стварэнні вобраза лірычнага героя і адлюстраванні ідэйнага зместу вершаў.

Ключавыя словы: індывідуальна-аўтарскі стыль, інтымная лірыка, граматыка, дзеяслоў, Л. Дранько-Майсюк.

UDC 81'38:[811.161.3:81'367.625]Л.Дранько-Майсюк

THE STYLISTIC PECULIARITIES OF VERB FORMS USING ON THE EXAMPLE OF LOVE POEMS BY L. DRANKO-MAISUK

M. Tryhuk,
PhD in Philology,
Associate Professor of the Department of Russian as a Foreign Language, MSLU

Received on 01.02.19.

Stylistic analysis is known as one of the approaches to the art text interpretation. Special attention is devoted to the author's style in particular to grammatical means as a means of the author's style creating. The love poems taken from the poetry collections "Unnatural Chance" and "Exhausted by Paris" by L. Dranko-Maisuk, the Belarusian popular modern author whose artworks have original context and means, were chosen for the research. The typical verb forms in the author's style and their stylistic characteristics are defined, their role as a means of creating the image of a lyric hero and as a means of sense reflection is also described in the article.

Keywords: author's style, love poems, grammar, verb, L. Dranko-Maisuk.

Беларускі паэтычны тэкст, адметны экспрэсіўнасцю, вобразнасцю, сэнсавым багаццем і шматграннасцю, з'яўляецца эстэтычнай каштоўнасцю. Як адзначаў І. Бродскі, «паэзія – гэта не "лепшыя словы ў найлепшым парадку", гэта ёсць найвышэйшая форма існавання мовы» [1]. Паэт прагне выказаць сваю думку і ўздзейнічаць на чытача пэўным спосабам, але ў адрозненні ад празаіка сутыкаецца з абмежаваннямі, абумоўленымі вершаванай формай. Відавочна, што паэтычны тэкст – гэта складаная сукупнасць рознаўзроўневых сродкаў моўнай сістэмы, якія адлюстроўваюць яе магчымасці і ў той жа час узаемадзейнічаюць паміж сабой, ствараючы індывідуальна-аўтарскі стыль. На першы план выходзяць стылістычныя функцыі моўных адзінак, якія ў розных спалучэннях перадаюць не толькі прадметна-лагічны змест, але і экспрэсіўную, эмацыянальную, ацэначную і эстэтычную інфармацыю [2]. Як вынік, цікавым становіцца стылістычны аналіз сучаснай беларускай паэзіі, які дазваляе скіраваць увагу на тэндэнцыі развіцця беларускай мовы.

Л. Дранько-Майсюк – папулярны сучасны аўтар, індывідуальна-аўтарскі стыль якога характарызуецца арыгінальнасцю зместу і сродкаў яго выяўлення. Як заўважаюць даследчыкі, стыль паэта – эмацыянальны, сімвалічны, насычаны перыфразай, алюзіяй, гукапісам, гратэскам, гіпербалай, аксюмаранам [3–6]. У выніку арыгінальнай спалучальнасці лексем актуалізуецца вобразная і асацыятыўная прырода слова. Вершы, змешчаныя ў зборніках аўтара «Магчымасць незвычайная» і «Стомленасць Парыжам» [7], перш за ўсё прысвечаны вечнай тэме кахання. Каханне героя мае розны характар: ён можа быць шчасліва закаханым, ахопленым неўзаемным ці нездаровым пачуццём, расчараваным у каханні, пакінутым у адзіноце. Традыцыйна пры аналізе паэтычнага твора перавага надаецца стылістычным функцыям лексічных сродкаў. Сярод граматычных сродкаў, у першую чаргу, звяртаюць на сябе ўвагу дзеяслоўныя формы, што абумоўлена іх высокімі стылістычнымі магчымасцямі і разнастайнасцю і частотнасцю іх ужывання ў інтымнай лірыцы Л. Дранько-Майсюка. Такім чынам, мэта артыкула – выяўленне стылістычнай ролі дзеяслоўных форм у інтымнай лірыцы Л. Дранько-Майсюка (на прыкладзе зборнікаў «Магчымасць незвычайная» і «Стомленасць Парыжам»).

А. В. Брадзіхіна называе лірычнага героя Л. Дранько-Майсюка Дон Жуанам [4]. Сапраўды, аб'екты пачуцця змяняюцца, лірычны ге-

Рэпазіторый БДПУ

рой расказвае пра асобныя моманты сваіх раманаў, разважае пра прычыны некаторых сітуацый і дзеліцца ўласнымі эмацыянальнымі перажываннямі. У беларускай мове, якая мае аспектуальныя адрозненні ў дзеяслоўнай сістэме, формы дзеяслова ўплываюць на ўспрыманне аповеду лірычнага героя. У дачыненні да лацінскай мовы гэты прынцып фармулюецца наступным чынам: «Перфектам маўленне рухаецца наперад, імперфектам яно спыняецца» [8, с. 28]. Формы незакончанага трывання быццам запавольваюць плынь часу, формы закончанага трывання рухаюць яго наперад. Сярод форм прошлага часу пераважаюць формы закончанага трывання ў прамым і пераносным значэннях. У аповедзе героя формы прошлага часу ўказваюць на рэальныя падзеі, якія адбываліся ў яго жыцці, ці на падзеі, якія па нейкіх прычынах не адбыліся. Дзеясловы ў прамым значэнні ствараюць вобраз закаханага, які адчувае каханне і адначасова аналізуе гэтае пачуццё (*спазнаў, забыўся, паверыў, адчуў, прадчуваў, захапіўся, палюбіў, здалося, напалохаў* і інш.). Так, каханая асацыюецца ў яго з колерам *...сонечнай вады, // Якой не высахнуць ніколі.* Тым не менш у душы героя ўзнікаюць песімістычныя думкі: *І я* ***паверыў*** *мастаку, у лёс ягоны самагубны, // Што звон магільнага пяску //* ***Дадаў*** *у колер непадкупны.* Паступова лірычны герой усведамляе памылковасць паралелі паміж сваім раманам і кніжнымі ідэямі: *Сваёю кніжнаю трывогай // Я напалохаў і цяпер – // Я варты кары самай строгай.*

Значная колькасць дзеясловаў закончанага трывання ўваходзіць у склад метафар. Большасць з іх характарызуе стан лірычнага героя ў няпростыя хвіліны яго раману, калі ён сутыкаецца з непаразуменнем ці ўжо згасаннем пачуцця. Пачуцці, што перадае метафара, суадносяцца з асобай лірычнага героя ці яго каханай, для чаго выкарыстоўваюцца асабовыя займенніки 1-й і 2-й асобы. Напрыклад, у апісаннях складаных для герояў сітуацый яны самі вызначаюць сваю будучыню: *І я спазнаў,* ***я выпаліў*** *датла // Цвярозасці барачнай збудаванне…,* ***Ты развязала*** *горла салаўю, // Туман* ***паклала*** *на каленкі.* У гэтых кантэкстах актуалізуецца сінтаксічнае значэнне выніковасці, якое дапамагае расставіць акцэнты ў развіцці рамана. Акрамя таго, змены перадаюцца пераносным выкарыстаннем дзеяловаў са значэннем руху, якія падкрэсліваюць дынамічнасць сітуацый і настрою герояў (*паляцела, прыйшла, прыплыла, плыве, узышла, прывалок, заблудзіўся, бліснуў, завіравалі*): *Тут і* ***ўзышла*** *сляза твая // Над патаемным нашым садам; Мы разам, і расстанне, што было, // У свой кароткі вырай* ***паляцела***. У апошнім прыкладзе прымірэнне героя і яго каханай граматычна перадаецца займеннікам *мы* са значэннем сумеснага суб'екта дзеяння. Гэты займеннік набывае тут стылістычную функцыю, бо значна часцей у аналізуемых вершах выкарыстоўваецца займеннік *я* і яго формы. Акрамя таго, у вершах паэта граматычнае супрацьпастаўленне 1-й і 2-й асобы можа падкрэсліваць канфлікт героя і гераіні, што вядзе да расчаравання ў каханай ці растання (***Я на цябе*** *накрычаў, //* ***Ты*** *гаварыла – не слухаў, // Бліснуў запалкай адчай, //* ***Бліснуў*** *і не патухнуў…*).

Уплыў асобы на ўласныя пачуцці можа памяншацца, што назіраецца пры расчараванні і паступовым згасанні кахання: *А з валасоў каханкі ўсё гусцей // Пялёсткі не жывыя, а сухія // Завіравалі да* ***маіх*** *вачэй…, // прыйдзе міг, калі* ***а*** *на грудзі // Заранка залатая не ўпадзе. // І вось* ***не ўпала****…* Ужыванне асабовага і прыналежнага займеніка ва ўскосных склонах суадносіць эмацыянальны стан і асобу, відавочным становяцца якасныя змены ў адносінах закаханых. Тым не менш не адбываецца дэталізацыі сітуацыі. Пачуцці могуць змяняцца супраць волі асобы, на што ўказвае пасіўная сінтаксічная канструкцыя з вінавальным склонам займенніка *мяне*: *У гэтае імгненне* ***прыгажосць пакінула мяне і азарэнне****, // І толькі* ***злосць****, адна пустая* ***злосць аблытала*** *цяжкім сваім карэннем.* Такім чынам, формы прошлага часу закончанага трывання са значэннем выніковасці вылучаюць пераломныя моманты ў развіцці рамантычных адносін. Пастаянная пільная ўвага лірычнага героя да ўласных пачуццяў і ў меншай ступені – да пачуццяў жанчыны падкрэслівае спалучэнне постацяў рамантыка і аналітыка ў яго светаўспрыманні.

Агульнае ўяўленне аб рамантычных адносінах складаецца не толькі з указання на пераломныя моманты, але і з апісанняў сітуацый. Формы прошлага часу незакончанага трывання маюць значэнне неабмежаванай працэсуальнасці і ў большасці выпадкаў канкрэтызуюць душэўны стан героя ці жанчыны: ***Любіла ты****, і пачуццю твайму // Што ў гэтым свеце роўнае?; Але навальніца* ***пужала****, // Святло* ***вынішчала*** *з душы – // Ты жонка, ты жонка чужая, // І муж я таксама чужы.* Часцей за ўсё дзеянні ці душэўны стан аднаго з закаханых суадносяцца з дзеяннямі ці станам другой асобы: ***Я*** *ваша цярпенне туманам* ***няволіў****, //* ***Я вас*** *апускаў на халоднае дно.* Лірычны герой праз далечыню ўглядаецца ў балкон каханай і адчувае, як *...дом уздыхаў, як сад, // І раіў блакітнаю лістотаю // Не ехаць, вярнуцца назад // І дыхаць віной і пяшчотаю.* Пачуцці гераіні супрацьлеглыя, што падкрэсліваецца граматычнай апазіцыяй займеннікаў 1-й і 2-й асобы, антонімамі і метафарамі, якія разам афармляюць прыём кантрасту: *Твой дом не маўчаў, а ты // Не звала мяне і не клікала, // Ружоўнік тваёй нематы // Ахоўвала крыўда вялікая...*

Рэпазіторый БДПУ

У цэлым названыя формы дазваляюць чытачу глыбей зразумець унутраны свет лірычных герояў і матывы іх учынкаў.

Акрамя формаў прошлага часу закончанага і незакончанага трывання, для апісання мінулых падзей у вершах выкарыстоўваецца форма цяперашняга часу ў значэнні мінулага. Як правіла, дзеясловы ўжываюцца ў метафарычным сэнсе і служаць для адлюстравання эмацыянальнага стану асобы, напрыклад жанчыны: *У вашым голасе* ***квітнеюць астры****, // якіх я не бачыў раней;* ***І позірк*** *твой, за матылька лягчэйшы, //* ***Ляціць*** *на просьбу спевака;* ***Ты абдымаеш*** *голасам мяне – // Павоем эратычнае навукі, // І голас твой у гэты міг мацней // За мілас – грацыёзны і бязрукі; І, снежань упрыгожыўшы сабою, //* ***Не закрываешся*** *ад халадоў // Ні хустачкай і ні маёй журбою.* Герой канцэнтруецца на развіцці рамана і дэталёва перадае стан сваёй спадарожніцы, пры гэтым ён у думках звяртаецца да яе, аб чым сведчыць выкарыстанне форм са значэннем 2-й асобы і зваротка. Адзначаныя сродкі набліжаюць падзеі да чытача, здымаюць часавую дыстанцыю і надаюць маўленню эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць.

Лірычны герой спрабуе зазірнуць у будучыню, вобраз якой узнікае незалежна ад абставін асабістага жыцця. Формы дзеясловаў будучага часу закончанага трывання апісваюць сумеснае шчасце: *Мы ведаем, што* ***не пакрыўдзіць лёс****;* ***Атуліць*** *нас ні* ***лёс****, ні* ***час****, // А* ***холад*** *восеньскага Менска; //* ***Ніхто не патрывожыць*** *нас – // Ні* ***вучань*** *юны, ні* ***маэстра****. //* ***І дождж не патрывожыць****...* У стварэнні вобраза шчаслівай будучыні ўдзельнічаюць формы займенніка *мы* са значэннем сумеснага суб'екта дзеяння, форма дзеяслова *ведаем* са значэннямі цяперашняга пашыранага, якая падкрэслівае ўпэўненасць героя, а таксама ўвасабленні. Роздум аб будучым кахання можа быць выкліканы складанасцямі ў адносінах, якія могуць быць пераадолены: *Ты ўжо чуеш, як свечка плача // На блакітным летнім акне, //* ***Пройдзе*** *восень над Белай дачай //* ***І патоне*** *ў нашым віне.* Дзеясловы са значэннем перамяшчэння ў прасторы ў метафарычным выкарыстанні *(пройдзе восень і патоне, надыдзе пустата)* адлюстроўваюць зменлівы характар сітуацый, мажлівасць пераадолення абставін. Каханне героя настолькі моцнае, што ён гатовы прабачыць здраду: *А першаю біблейскаю вадой //* ***Абмыю*** *грэх, такі неспадзяваны; //* ***І выцалую*** *ночы ўсе і дні, // Напоўненыя не маёй уладай... // І, прагнучы да болі чысціні, – // Усё тваё* ***не назаву*** *я здрадай.* Формы займенніка і дзеясловаў са значэннем 1-й асобы адзіночнага ліку суадносяцца з адзінотай закаханага. Не заўсёды каханне магчыма вярнуць, што падкрэсліваецца формамі будучага закончанага трывання, мадальнага безасабовага дзеяслова *давядзецца* са значэннем знешняй неабходнасці, змушанасці ў спалучэнні з інфінітывам, які абазначае патэнцыяльна магчымае дзеянне: *Што мне пакінеш? Сум і прахалоду, // Якімі давядзецца з году ў год // Паэзію славянскага зыходу // Аплакваць, павярнуўшыся на ўсход. // Не здолею пазбегнуць гэтай страты...*

У вершах паэта актыўна выкарыстоўваюцца не толькі формы дзеясловаў абвеснага ладу ў розных сінтаксічных значэннях, але і формы загаднага ладу. Як адзначае У. А. Плунгян, існуе два «цэнтры кансалідацыі» ў зоне мадальнасці – «адносіны моўцы да сітуацыі» і «статус сітуацыі адносна рэальнага свету», а лад уяўляе сабой «граматыкалізаваную мадальнасць» [9, с. 309]. Формы загаднага ладу ў маўленні лірычнага героя ўказваюць на рэфлексію і, як правіла, выражаюць значэнні жадання і прымушэння да дзеяння ў адносінах да каханай: ***Павер, павер,*** *усё не так [...] //* ***Прабач,*** *каханая, цябе // Сваёю кніжнаю трывогай // Я напалохаў і цяпер – // Я варты кары самай строгай; Ты* ***заставайся*** *маёй і чужой, // Я застануся тваім і чужым...* Можна заўважыць, што загадны лад выкарыстоўваецца ў сітуацыях, калі герой сутыкаецца з адзінотай. Гэтыя формы апісваюць нерэальныя сітуацыі, ствараюць для чытача такі план развіцця рамана, якім хоча бачыць яго лірычны герой. Акрамя таго, загадны лад можа перадаваць унутраны дыялог лірычнага героя. У такім выкарыстанні на першы план выходзяць значэнні мажлівасці і пажаданасці, канструкцыі набываюць значэнне парады, як трымаць сябе ў пэўнай сітуацыі: *Позна.* ***Вяртайся*** *асфальтавым долам, // Свечкі трамвайнай губляючы бліск […] // Цемру* ***любі*** *і дарогу начную, // З рызыкай яснай* ***зайдзі*** *ў казіно // Выйграць настрой...* Зварот да сябе можа быць іранічным, што падкрэслівае роспач, якую адчувае герой пасля расстання: *Патухла свечка летняя. Даволі! // Адно прадонне і адзін зеніт. // «Паэт не памыляецца ніколі,» – // Што ж,* ***радуйся,*** *самотны Леанід.* Супастаўленне кантэкстаў з формамі загаднага ладу дазваляе выявіць асаблівасці разумення кахання героем. Так, для героя каханне праяўляецца ў пастаянным руху ад стомленасці хваляваннем да супакаення і лагоды і наадварот: *Ты* ***праплывай*** *заўсёды нада мной // І ў ружу* ***завівай*** *маё дыханне, //* ***Здзіўляй*** *мяне парнаскаю цаной, //* ***Стамляй*** *парнаскім хваляваннем;* ***Накрэслі*** *мне супакаення знак // І* ***заставайся*** *нада мною.* Пры выкарыстанні часціцы *няхай* семантыка загаднага ладу набліжаецца да мадальнасці пажаданасці: ***Няхай*** *душа мая* ***заходзіцца*** *//* ***І задыхаецца няхай.*** Формамі загаднага ладу павялічваецца экспрэсіўнасць маўлення, ствараецца план магчымай будучыні, перадаецца адкрытасць героя ў яго

Рэпазіторый БДПУ

пажаданнях. У цэлым афармляецца ідэя непрадказальнасці і мнагапланавасці жыцця.

У маўленні лірычнага героя частотна ўжываецца неазначальная форма дзеяслова. Паколькі гэтая форма толькі называе дзеянне і ніяк не вызначае яго адносін да асобы ці часу, рэальнасці ці ірэальнасці [10], у кантэксце яна можа набываць розныя сінтаксічныя значэнні. Напрыклад, у безасабовым сказе з інфінітывам і семантычным суб'ектам, выражаным формай давальнага склону, узнікае значэнне прадвызначанасці [11]. Гэтыя канструкцыі паказваюць, якім бачыць герой развіццё рамана ці сваё жыццё пасля расстання (*Там нам* ***стаяць*** *і* ***цалаваць*** *// Сваю надзею трапяткую…; Цяпер* ***ляжаць*** *мне ў элегічнай яме // На камяністым дне*). Розныя формы дзеяслова ўдзельнічаюць у стварэнні плана будучага, думкі аб якім узнікаюць у героя часцей, чым думкі аб мінулым. Такая асаблівасць адлюстроўвае рамантычнае светаўспрыманне героя. Інфінітывы, як сродкі абазначэння патэнцыяльна магчымых дзеянняў, могуць спалучацца з мадальнымі дзеясловамі са значэннямі пажаданасці, мажлівасці, неабходнасці ці павіннасці і канкрэтызаваць валявую сферу героя: ***І жыць хацелася*** *чысцей і маладзей, // Кроў ап'яніўшы гэтаю часінай; Яшчэ* ***магу кахаць,*** *і* ***падабацца,*** *// І чыстым* ***быць,*** *як зорка і дзіця.* Стылістычную функцыю інфінітыва як сродку абазначэння патэнцыяльна магчымых дзеянняў выразна дэманструе верш-разважанне аб ролі кахання ў жыцці «Раса ярчэй, калі яе ў трывогу...»: *Дзіця бывае позніи, а каханне // Ніколі познім не бывае.* Сярод дзеяслоўных форм у вершы пераважаюць інфінітывы, якія перадаюць погляд героя на каханне, сугучны з аўтарскім: *Раса ярчэй, калі яе ў трывогу // Нібыта ў футурал,* ***пакласці*** *// І на лісці засмучанага глогу //* ***Настояць*** *незасмучанае шчасце.* Каханне становіцца мацнейшым, калі яно спалучана з неспакоем. Інфінітывы адзначаюць асобныя падзеі, якія хутчэй за ўсё мелі месца ў рамане героя (*І можна* ***суцяшаць*** *сябе давеку, //* ***І збіцца*** *з лёсу, нібы* ***збіцца*** *з тропу, // Заходзячы ў расы, як у аптэку, // пацвельваючы кожную хваробу...*) ці выйсце з пэўнай сітуацыі (*Калі надыдзе раптам пустата – // Галінку глога* ***апусціць*** *у сэрца, // Не вырываючы яе з куста*). Ужыванне форм інфінітыва надае вершу філасофскае гучанне, бо выводзіць яго па-за межы канкрэтнага рамана і акцэнтуе матыў трывогі як важнейшы ў паэзіі Л. Дранько-Майсюка.

Каханне залежыць ад волі каханкаў, абставін, долі. На граматычным узроўні гэтая ідэя ўзаемаабумоўленасці адлюстравана выкарыстаннем сінтаксічных канструкцый з залежнымі дзеепрыметнікамі. Як шчасце, так і няшчасце могуць быць прадвызначаны, што падкрэсліваецца спалучэннем залежнага дзеепрыметніка з давальным адрасата: *Мне шчасце* ***дадзена*** *магчымае // І з ім такое адкрыццё, – // Што толькі з гэтаю жанчынаю // Спазнаю поўнае жыццё...* Герой можа паказвацца як носьбіт чужой волі ці, наадварот, як суб'ект, чыя воля вызначае стан аб'екта: *Снапок – букецік – матылёк, // Чырвонай ніткаю* ***звязаны,*** *// У тытунёвы трапіў змрок // І задыхнуўся,* ***пакараны*** *// Табой і мною.*

Значную ролю ў адлюстраванні ідэйнага зместу зборніка адыгрываюць сінтаксічныя структуры з назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі ў ролі галоўных членаў сказа, якія набываюць кантэкстуальнае значэнне цяперашняга пастаяннага. Напрыклад, у вершы «Ты, як малітва да Бога...» акрэсліваецца роля каханай у жыцці лірычнага героя: ***Ты, як малітва*** *да Бога, // Недашаптаная мной, – // Чыстага снегу знямога // Над беларускай зімой!* ***Ты*** *– ад нямоты* ***збавенне,*** *// Мой пурпуровы* ***ўзвіў.*** На нашу думку, перад параўнальнай часціцай *як* выкарыстаны аўтарскі знак прыпынку. Стылістычныя сродкі (параўнанне, метафара, прыём кантрасту, створаны кантэкстуальнымі антонімамі) узмацняюць аўтарскую ідэю выключнай ролі каханай. Гэтая ідэя падкрэсліваецца адсылкай да рэлігійнага сюжэта (*Знай – і тваё нараджэнне // Снег віфлеемскі спавіў*) і пасля ўдакладняецца наступным чынам (***Усё – падман, усё – падман,*** *// І толькі не* ***падман – каханне!***), прычым сінтаксічны паралелізм, паўтор і прыём кантрасту ўзмацняюць яе экспрэсіўнасць. У вершах акцэнтуецца складанасць лёсу каханай паэта і непарыўная сувязь кахання з таемнасцю і маладосцю: ***…Паэт*** *// Перад каханай вечна* ***вінаваты*** *// І свет яго штодзённай* ***страты свет; Таемнасць, маладосць – бальзам адзіны,*** *// Адзіны для мужчыны і жанчыны, // Які дапамагае не старэць.* Адмаўляецца аўтарам небяспечны для кахання стэрэатып: *Жаночы* ***смутак – смутак без прычыны,*** *// Жаночы* ***смутак*** *– лёгкая* ***цана.*** На змену яму прыходзіць выснова: *...Адзіноты кожнае імгненне //* ***Не Бог дае*** *жанчыне –* ***сатана,*** форма цяперашняга пастаяннага ў якой выступае як знак абагульненага назірання. Інфінітыў як галоўны член сказа з дзейнікам, выражаным назоўнікам, таксама набывае сінтаксічнае значэнне цяперашняга пастаяннага і прэзентуе блізкі да аўтара погляд на жыццёвыя сітуацыі, у прыватнасці падкрэслівае каштоўнасць кахання: *І мара – шчыра* ***шкадаваць,*** *// Што патушыла ноч ліхтарню // Невыпадкова, а знарок...*

Для ідыястылю Л. Дранько-Майсюка характэрна ўжыванне дзеясловаў у метафарычным значэнні, форм прошлага часу незакончанага трывання як сродку дэталізацыі стану асобы, форм цяперашняга часу ў значэнні прошлага, загаднага ладу і спалучэнняў інфінітыва з мадальнымі дзеясловамі як сродку

Рэпазіторый БДПУ

канкрэтызацыі валявой сферы лірычнага героя. Часта ўжывальныя сінтаксічныя структуры са значэннем цяперашняга пастаяннага афармляюць адносіны аўтара да кахання. Такім чынам, у інтымнай лірыцы паэта дзеяслоўныя формы з'яўляюцца «падмуркам» індывідуальна-аўтарскага стылю, акцэнтуюць ідэйны змест вершаў і адыгрываюць значную ролю ў стварэнні мастацкага вобраза лірычнага героя, бо выводзяць на першы план эмацыянальную, валявую і аналітычную сферы яго асобы.

Літаратура

1. *Бродский, И.* Поэт и проза [Электронный ресурс] / И. Бродский // Библиотека Максима Мошкова. – Режим доступа: http://lib.ru/BRODSKIJ/br_poetprosa.txt. – Дата доступа: 16.01.2019.
2. *Арнольд, И. В.* Читательское восприятие и герменевтика / И. В. Арнольд // Интертекстуальные связи в художественном тексте : межвуз. сб. науч. тр. / Рос. гос. пед. ун-т ; редкол.: И. В. Арнольд (отв. ред.) [и др.]. – СПб., 1993. – С. 4–12.
3. *Бельскі, А.* Вечныя імгненні хараства, або Паэт, які кахае / А. Бельскі // Крыніца. – 2001. – № 7 (67). – С. 47–52.
4. *Брадзіхіна, А. В.* Ці лёгка быць Дон Жуанам? (Страх і яго мадыфікацыі ў лірыцы Л. Дранько-Майсюка) / А. В. Брадзіхіна // 90 – 60 – 90. – Гомель : ГДУ, 2014. – С. 42–55.
5. *Злотнікава, М. С.* Параўнальны аналіз творчасці Л. Дранько-Майсюка і Максіма Багдановіча / М. С. Злотнікава // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры ; рэдкал.: А. А. Манкевіч (укл.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 125–129.
6. *Русілка, В.* Акропаль па-беларуску, ці Ратаванне прыгажосцю / В. Русілка // Полымя. – 1995. – № 3. – С. 243–248.
7. *Дранько-Майсюк, Л.* Вершы. Каханне. Проза. Выбранае / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Харвест, 2003. – 302 с.
8. *Маслов, Ю. С.* Типология славянских видовременных систем и функционирование форм претерита в «эпическом» повествовании / Ю. С. Маслов // Теория грамматического значения и аспектологические исследования : сб. тр. / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания ; редкол.: А. В. Бондарко. – Л. : Наука. Ленингр. Отд-ние, 1984. – С. 22–42.
9. *Плунгян, В. А.* Общая морфология. Введение в проблематику / В. А. Плунгян. – М. : URSS : Либроком, 2012. – 383 с.
10. Инфинитив [Электронный ресурс] // Русская грамматика : Академия наук СССР. Институт русского языка. – Режим доступа : http://rusgram.narod.ru/1576-1595.html#1594. – Дата доступа : 16.01.2019.
11. *Падучева, Е. В.* Конструкции с независимым инфинитивом [Электронный ресурс] / Е. В. Падучева // Русская корпусная грамматика. – Режим доступа : http://rusgram.ru. – Дата доступа: 16.01.2019.

References

1. *Brodskiy, I.* Poet i proza [Elektronnyy resurs] / I. Brodskiy // Biblioteka Maksima Moshkova. – Rezhim dostupa: http://lib.ru/BRODSKIJ/br_poetprosa.txt. – Data dostupa: 16.01.2019.
2. *Arnold, I. V.* Chitatelskoye vosprivatiye i germenevtika / I. V. Arnold // Intertekstualnyye svyazi v khudozhestvennom tekste : mezhvuz. sb. nauch. tr. / Ros. gos. ped. un-t ; redkol.: I. V. Arnold (otv. red.) [i dr.]. – SPb., 1993. – S. 4–12.
3. *Belski, A.* Vechnyya imgnenni kharastva, abo Paet, yaki kakhaye / A. Belski // Krynitsa. – 2001. – № 7 (67). – S. 47–52.
4. *Bradzikhina, A. V.* Tsi lyogka byts Don Zhuanam? (Strakh i yago madyfikatsyi u lirytsy L. Dranko-Maysyuka) / A. V. Bradzikhina // 90 – 60 – 90. – Gomel : GDU, 2014. – S. 42–55.
5. *Zlotnikava, M. S.* Paraunalny analiz tvorchastsi L. Dranko-Maysyuka i Maksima Bagdanovicha / M. S. Zlotnikava // Tvorchasts Maksima Bagdanovicha u kantekstse susvetnay litaratury ; redkal.: A. A. Mankevich (ukl.) [i insh.]. – Minsk, 2011. – S. 125–129.
6. *Rusilka, V.* Akropal pa-belarusku, tsi Ratavanne prygazhostsyu / V. Rusilka // Polymya. – 1995. – № 3. – S. 243–248.
7. *Dranko-Maysyuk, L.* Vershy. Kakhanne. Proza. Vybranaye / L. Dranko-Maysyuk. – Minsk : Kharvest, 2003. – 302 s.
8. *Maslov, Yu. S.* Tipologiya slavyanskikh vidovremennykh sistem i funktsionirovaniye form preterita v "epicheskom" povestvovanii / Yu. S. Maslov // Teoriya grammaticheskogo znacheniya i aspektologicheskiye issledovaniya : sb. tr. / Akad. nauk SSSR, In-t yazykoznaniya ; redkol.: A. V. Bondarko. – L. : Nauka. Leningr. Otd-niye, 1984. – S. 22–42.
9. *Plungyan, V. A.* Obshchaya morfologiya. Vvedeniye v problematiku / V. A. Plungyan. – M. : URSS : Librokom, 2012. – 383 s.
10. Infinitiv [Elektronnyy resurs] // Russkaya grammatika ; Akademiya nauk SSSR. Institut russkogo yazyka. – Rezhim dostupa : http://rusgram.narod. ru/1576-1595.html#1594. – Data dostupa : 16.01.2019.
11. *Paducheva, Ye. V.* Konstruktsii s nezavisimym infinitivom [Elektronnyy resurs] / Ye. V. Paducheva // Russkaya korpusnaya grammatika. – Rezhim dostupa : http://rusgram.ru. – Data dostupa: 16.01.2019.

Рэпазіторый БДПУ